# 38 ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ (да дня нараджэння прафесара Н. А. Булацкай)

*Біялагічны ўзрост не заўсёды супадае з узростам душы. Юбілей – мажлівасць не падкрэсліць круглую дату, а выказаць чалавеку падзяку ад калег і студэнтаў, узгадаць значныя моманты жыцця.*

*У красавіку споўнілася 60 гадоў кандыдату філалагічных навук, прафесару кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры Наталлі Аляксееўне Булацкай – філолагу-прафесіяналу, добрасумленнаму і патрабавальнаму да сябе, калег і студэнтаў чалавеку і проста абаяльнай жанчыне.*



Наталля Аляксееўна нарадзілася 27 красавіка 1953 г. у г. Навазыбкаве Бранскай вобласці ў сям'і ваеннага лётчыка Савецкай Арміі, рускага па нацыянальнасці, і беларускі – урача. Лёс звязаў сям'ю Наталлі Аляксееўны і з Расіяй, і з Беларуссю і выхаваў інтэрнацыяналістам, які ведае і шануе нацыянальнае.

Сярэднюю агульнаадукацыйную і музычную школы Н. А. Булацкая скончыла ў г. Валгаградзе. Вышэйшую адукацыю атрымала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна на філалагічным факультэце, пасля заканчэння якога ў выніку размеркавання апынулася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Яна адданая прафесіі і ўніверсітэту, у якім працуе з 1975 г., – моманту заснавання гэтай навучальнай установы. Стаж яе педагагічнай работы ва ўніверсітэце складае 38 гадоў!

У 1988 г. Н. А. Булацкая скончыла аспірантуру БДУ, абараніла ў МДУ імя М. Ламаносава кандыдацкую дысертацыю, атрымала ступень кандыдата філалагічных навук, а ў 1994 г. – вучонае званне дацэнта. З 1993 па 2006 г. узначальвала кафедру сусветнай літаратуры ўніверсітэта, а пасля структурнага пераўтварэння працавала дацэнтам, на дадзены момант – прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры.

Яшчэ ў перыяд студэнцтва працавала ў Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спутник» гідам-перакладчыкам. З таго часу яе цікавасць да падарожжаў перарасла ў сапраўднае захапленне. Яна наведала шмат краін: Чэхію, Польшчу, Егіпет, Венгрыю, ААЭ, Францыю, Іспанію, Румынію, Балгарыю, Манака, іншыя краіны, – знаёмства з культурай, мастацтвам якіх станавілася дапаможным матэрыялам пры выкладанні сусветнай літаратуры студэнтам нашай ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў яна выкладае дысцыпліны філалагічнага цыкла. Валодае сучаснымі інавацыйнымі методыкамі, у рабоце выкарыстоўвае электронныя сродкі. З'яўляецца старшынёй прадметна-метадычнай камісіі па сусветнай літаратуры. Не адно дзесяцігоддзе выконвала абавязкі старшыні прадметнай камісіі па беларускай (рускай) мове і літаратуры на ўступных экзаменах ва ўніверсітэт, неаднаразова была адказным арганізатарам правядзення рэспубліканскага цэнтралізаванага тэсціравання.

Як загадчык кафедры сусветнай літаратуры садзейнічала ўвядзенню ў вучэбны працэс спецкурсаў па літаратуры, дзяржаўнага экзамену па сусветнай літаратуры на факультэце завочнага навучання. Кафедра мела кантакты з амбасадамі Расіі, Японіі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі як нашай краіны, так і замежных.

За перыяд работы ва ўніверсітэце надрукавала болей за 60 работ навуковага, вучэбна-метадычнага характару, у ліку якіх вучэбныя праграмы па базавых курсах, вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў універсітэта, артыкулы. У актыве Н. А. Булацкай навуковае кіраўніцтва кафедральнымі навуковымі пяцігадовымі тэмамі, магістранцкімі работамі грамадзян Кітая, шматлікімі студэнцкімі работамі; апаніраванне і водгукі на кандыдацкія дысертацыі і аўтарэфераты дысертацый; работа ў якасці навуковага эксперта кандыдацкіх дысертацый супрацоўнікаў універсітэта і даследаванняў у межах Дзяржаўнай навуковай праграмы НАН Беларусі «Інавацыйныя праекты ў галіне літаратуразнаўства». З моманту стварэння ва ўніверсітэце Праблемнага савета па філалагічных навуках па сённяшні дзень з'яўляецца старшынёй гэтага навуковага ўтварэння, праз якое прайшло нямала дысертацыйных работ з іншых ВНУ.

Наталля Аляксееўна на працягу шэрагу гадоў была членам Савета ўніверсітэта, метадычнай рады факультэта завочнага навучання, Савета ФІДК, гуманітарнай рады ўніверсітэта.

Н. А. Булацкая – аўтар артыкулаў па актуальных праблемах філалогіі і журналістыкі, напрыклад: «Последний роман С. М. Степняка-Кравчинского “Штундист Павел Руденко”» (1989), «Чтение студентами художественной литературы как труд и творчество» (2006), «Телевидение и культура: проблемы, которые нужно решать» (2010); вучэбнага дапаможніка «История русской литературы XIX века в схемах и комментариях» (2003), вучэбна-метадычнага дапаможніка «Славянские литературы: классика и современность (болгарская, польская, сербская, чешская)» (2011) і іншых значных работ.

Для Наталлі Аляксееўны такія паняцці, як прыстойнасць, добрасумленнасць з'яўляюцца канкрэтнымі катэгорыямі, а людзі, якія імі валодаюць, цэняцца найбольш. Яна не трымае зла, не любіць чынашанаванне, прынцыпова і адкрыта выказвае сваю пазіцыю.

Строга і патрабавальна ставячыся да студэнтаў, яна не выклікае ў іх скаргаў. Можа таму, паважаны і вопытны выкладчык, Н. А. Булацкая неаднаразова перамагала ў студэнцкіх штогадовых намінацыях «Самы прыстойны выкладчык універсітэта», «Самы патрабавальны выкладчык універсітэта», «Лепшы аратар ФІДК», «Самы строгі выкладчык універсі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэта», «Самы стыльны выкладчык». Раяцца з педагогам і пачынаючыя празаікі і паэты, якія давяраюць свае творы не кожнаму. Яе былыя вучні сёння сталі вядомымі дзеячамі беларускага мастацтва, займаюць адказныя дзяржаўныя пасады, памятаючы пра ўрокі, якія былі атрыманы ад Наталлі Аляксееўны. Так, генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі С. Кухто ў адным з інтэрв'ю ўспамінаў: «У мяне была найцікавейшая выкладчыца па рускай літаратуры – спадарыня Булацкая! Дзякуючы ёй, я "Братоў Карамазавых" ведаю практычна на памяць. Многія з прадметаў шанцавала здаваць наскокам… Чамусьці я думаў, што так атрымаецца і з літаратурай. Але… Гэта была такая глыба, якую проста так не пераскочыш. І толькі цяпер я разумею, наколькі тады мне гэта было неабходна, каб спасцігнуць нешта ў сабе… І цяпер я вельмі ўдзячны гэтаму чалавеку. Не было б у маім жыцці гэтага, здаецца, вельмі многае я б пераступіў у сваім жыцці, не пакінуўшы нічога ў сабе».

Заслугі Н. А. Булацкай былі адзначаны Ганаровымі граматамі і падзякамі Міністэрства адукацыі і кіраўніцтва ўніверсітэта. Ганарыцца Наталля Аляксееўна і сынам-журналістам, лаўрэатам дзвюх «Тэлевяршынь», мужам, выдатнікам адукацыі, які ўзначальвае кафедру Інстытута журналістыкі БДУ, двума цудоўнымі ўнукамі.

Разважаючы пра жыццё і азіраючыся на пражытыя гады, Наталля Аляксееўна пагаджаецца з выказваннем Льва Талстога: «На свеце ёсць толькі два няшчасці – згрызоты сумлення і хвароба. Астатняе – шчасце».

*Кафедра беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ